слова...» У вянок класікам

Дар'я ШАБЕЛЬСКАЯ,
студэнтка 3 курса

Наш улюбёны беларус-Янук…

(эсэ)

Табе, паэт, пішу скрозь час.
Дзякую, што аб'яднаць змог нас.
Ты публіцыст і драматург,
Наш улюбёны беларус-Янук.
Прабудзіў народ сваёй малітвай,
Крануў сэрцы, быццам бітвай.
Даў беларусам напоўніцца сілай,
Ганарымся табою мы цэлай краінай.

Менавіта з падзякі хацелася б пачаць сваё невялічкае эсэ.

Прыгажосць краіны, умацаванне ідэі аб самастойным гістарычным шляху, шчыры і балесны заклік да простага народа — усё гэта ў сваіх творах адлюстраваў Вялікі Творца — Янка Купала. Ён імкнуўся дапамагчы ўсім і кожнаму, ашчаслівіць іх і напоўніць сэрцы *«не з вясёласці яснай, не з ясных палацаў, / а з канаючай крыўды ў пахіленай хатцы»*.

Янка Купала быў і застаецца валадаром беларускага слова і, здаецца мне, як ніхто іншы спалучаў шчымлівую крыўду з глыбокаю вераю ў заўтрашні дзень.

Па жыцці для мяне Янка Купала перш за ўсё — Настаўнік. Таму я і іншыя купалаўцы ганарымся тым, што з'яўляемся студэнтамі ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Любоў да Купалавай творчасці ўзнікла ў мяне яшчэ ў школе... Далей, старонка за старонкай чыталіся творы… І вось… Я — студэнтка ГрДУ імя Янкі Купалы.

Вялікая падзяка Купалу-мысляру, беларускаму падзвіжніку, бруіць у маім сэрцы, а радок са свайго ж верша цепліць маю душу заўсёды: *«Наш улюбёны беларус-Янук»*.

Кацярына ГУДЗІНОВІЧ,
студэнтка 3 курса

Мой Янка Купала

(эсэ-разважанне)

Янка Купала — гэта бацька нашай беларускай літаратуры. Паэт-прарок, які заявіў, што *Беларусь жыве*. Калі толькі пачуеш гэта імя, адразу ўяўляецца нешта роднае, сваё, наскае.

Галоўнае месца ў Купалавай творчасці займае лірыка. Менавіта праз яе ён выяўляў усю прыгажосць і годнасць нашай Радзімы, думы аб свабодзе народа, заклік абудзіцца, каб стаць самадастатковай нацыяй. Янка Купала не баяўся выказваць свае думкі праз творы. Яго лірыка прасякнута нацыянальна-вызваленчымі матывамі. Вельмі кранае верш «Там», які з'яўляецца водгукам на рэвалюцыйныя падзеі:

Там кроў ліецца, там за волю
Барцы на вісельні ідуць,
А вы, вы мучаны найболей,
Спіцё, хоць вас даўно там ждуць.

Праўдзівасць, шчырасць, прастата — важнейшыя асаблівасці вершаў паэта.

Перачытала многія Купалавы творы — і да мяне папрасіўся ўласны верш:

Купала ў сэрцы,
Купала ў душы,
Адчыніўшы ўсе дзверцы
Для нас назаўжды.

Ты дбаў пра лёс наш,
Ганарыўся кутком.
Табе кажам «Дзякуй!»
І нізкі паклон.

«Купалаўцы» — гэта гучыць горда!

Я вельмі ганаруся, што з'яўляюся студэнткай Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, які змог не толькі адрадзіць родную мову, але і накіраваць нас на доўгую дарогу ў будучыню.

Вераніка САЎКО,
студэнтка 3 курса

Наш неўміручы й малады васілёк

Жыццё тваё было кароткім,
Не меў дзяцей, сваёй сям'і.
Таму і лёс надзвычай горкі —
Меў мала шчасця на зямлі.

У дзяцінстве сваім бесклапотным
Маці ты страціў сваю,
Лёс твой занадта гаротны,
Але словамі песціш душу маю.

Жыла беларуская мова
У тваёй такой чулай душы,
Ты любіў наша роднае слова
І тварыў, каб яго зберагчы.

Апошнія хвілінкі жыцця
Дажываў у чужым ты куточку,
Уцякаў ад свайго небыцця,
Туга па Радзіме — кожную ночку.

Калі вершы твае я чытаю,
У вачах зіхаціць аганёк.
За цябе ў малітве трываю,
Наш неўміручы і малады васілёк.

Дзякуй табе, Максіме,
За шчодры ўнёсак у мой юны свет.
Ганарыцца табою і наша Радзіма,
І ўвогуле цэлы Сусвет.

Прамень беларускай класікі

Дзякуй табе, слаўна Радзіма,
Што Янку Купалу дала нам за сына!
Ён табе доўг свой за нас адплаціў,
Творы свае ўсе нам падарыў.

Ён дбаў пра нашу людскую свабоду,
І каб натоўп мог звацца народам!
Засеяў калоссем палі Беларусі.
Ён — родны наш сімвал, ім ганаруся...

Ганаруся тым, што жыву ў Беларусі,
Ганаруся тым, што Купалаўцам завуся!
Тваё імя нацыянальнаю песняю стала,
Тваё імя Беларусь назаўжды захавала.

Памалюся з табою, Янка Купала,
Каб наша Айчына гора не знала,
Каб не ведала бед яна і нягод,
Каб вечна жыў беларускі народ!

Вольга НАВІЦКАЯ,
студэнтка 3 курса

Вечна жывы

Нібы сіні васілёк у калоссі,
Усё жыццё сумаваў Ты адзін.
Але Ты быў між нас не самотны.
Ты — Адна з беларускіх святынь.

Твой «Вянок» цешыць мне сэрца.
Зорка Венера свеціць уначы.
Ты адкрыў мне ў паэзію дзверцы,
Але сябе не змог зберагчы.

Мой васільковы, родны Максіме!
Я пакланюся Табе да зямлі!
Каб ведаў, што ў неўміручай сіле
Памяць аб словах-чарах Тваіх.

Ксенія УРБАНОВІЧ,
студэнтка 3 курса

Мой Янка Купала

(эсэ)

Тры гады таму я зрабіла адзін з самых важных крокаў у жыцці — выбрала спецыяльнасць, аб якой марыла. Атрымалася так, што гэта і ўніверсітэт маёй мары. Які гонар быць купалаўцам!

З творчасцю Янкі Купалы ўпершыню я пазнаёмілася ў пачатковых класах, калі вучылі верш «Хлопчык і лётчык». У сваіх успамінах вяртаюся ў тыя часы, калі чытала верш і радавалася таму, што таксама *«ўмею лётаць у сне»*, як той хлопчык з верша. Тады Купала быў для мяне паэтам-чараўніком, які сваімі радкамі пераносіў і ў лес да мядзведзя, і да зорак. Пасля вобраз Купалы ў маім уяўленні стаў істотна іншым, дадаліся новыя свежыя фарбы. Гэта адбылося пасля знаёмства з паэмамі, драматургічнымі творамі. Партрэт Купалы стаў яшчэ больш ясным і блізкім. Раней жа здаваўся далёкім, як сонца. З яго творчасцю, вобразамі, мадэлямі мыслення знаёміліся цяпер вельмі падрабязна ва ўніверсітэце.

Знакава тое, што Купала нарадзіўся на свята Купалле. У цудоўнае свята нябёсы падаравалі беларусам зорку — Купалу. Словы песняра праліліся з яго душы — і таму яны вечныя. Я ўдзячна лёсу за тое, што вучуся менавіта тут, ва ўніверсітэце, які з гонарам носіць імя Янкі Купалы. Свае вершаваныя радкі прысвячаю яму — Янку-песняру:

Паэт адраджае любоў да Радзімы.
Рэдактар газеты «Нашая Ніва»
Прарокам народным паўстаў перад намі.
Ім ганарыцца будзем вякамі.

Сказаў нам Купала некалькі слоў:
«Зямлю зберажыце бацькоў і дзядоў!
Трымайцеся дружна за роднае слова!»
Гучы праз вякі, мілагучная мова!

Маліўся ён сэрцам, каб родныя землі
Не ведалі болей страшнае долі.
Каб быў беларускі свабодны народ,
І песні спяваў не ў няволі.

Мы будзем маліцца душою празрыстаю,
Каб не было на Радзіме бяды,
А вершы Купалы стварылі адзінае
Шчасце людзей на вякі!

Дар'я ДЗЯШУК,
студэнтка 2 курса

Янку Купалу

Спачатку было ў нас Слова,
І гэта ўжо справы палова.
Потым між цемры быў свет
І мноства яскравых камет.

Калі б ты каметаю быў,
То хутка б сябе ты згубіў.
Калі ж ты як сонейка свет,
То вечна гучыць твой санет.

Калі ты як ветрык у полі,
То ведаеш справу і волю.
Калі ж гусляром быць народа,
То й ведаць і лёс, і гароты.

Ты ззяеш, як зорка ў небе,
Прарослы, як зерне ў глебе,
І чуюцца ў небе грымоты:
То голас твой — ліра народа.

Вераніка САЎКО,
студэнтка 3 курса

У імя свабоднай душы

(Цётцы-паэтэсе)

Ты жадаеш свабоды,
Ты хочаш тварыць,
Каб на доўгія годы
Было нам чым жыць.

Для дзетак ты прагнеш
Добрых ведаў з навукі,
Самаахвярнасць ты маеш,
Церпіш розныя мукі.

Кожную кабетку ты ўзвышала,
Тулілася туды, дзе радасці мала.
Каб прыніжанага абараніць ад злога,
У табе можна заўсёды знайсці дапамогу.

Нягледзячы на свае хваробы і голад,
Жыве ў табе роднае слова.
Малітвы свае ўзнясу я да Бога,
Каб толькі быў мір на зямлі і свабода.